А. В. Анцімонік

# Лірычны герой у творчасці Вікі Трэнас

Найноўшы лірычны герой, перш чым стаць такім, якім ён ёсць, зазнаў шэраг ператварэнняў і пераўвасабленняў, беручы за апору як архетыпы, так і постмадэрнісцкую «смерць аўтара» ды адсутнасць лірычнага «Я». Калі першасна суб'ект лірыкі з'яўляўся зазвычай стрыжнем усёй паэтычнай сістэмы, то з пачаткам панавання постмадэрнізму ён апынуўся выцесненым за межы гэтай структуры, пакінуўшы замест сябе канцэпты, моўныя слаі і маскі для наратыўных (або апавядальных) фігур, якія пастаянна ўзаемадзейнічаюць, напаўняючы сэнсавую прастору лірыкі.

І на лірыцы, і на яе суб'екце адбіваецца складанае і цікавае спалучэнне традыцыйнай, мадэрнісцкай і постмадэрнісцкай канцэпцый. На новым этапе развіцця прыгожага пісьменства мы ўжо назіраем вяртанне лірычнага героя, які акрэслівае сваё існаванне двупланавасцю: суіснаваннем адрозных наратыўных інстанцый у адным тэксце. Суб'ект лірыкі перажывае эвалюцыю, а для ўсталявання даверу паэты нярэдка выкарыстоўваюць літаратурную спавядальную шчырасць. Таму сёння праблема лірычнага героя не можа быць паўнавартасна вырашанай на глебе размежавання аўтара і лірычнага героя. Пры прачытанні таго ці іншага пісьменніка варта памятаць пра магчымую падобнасць, але ніколі не тоеснасць наратыўных фігур.

Многаварыянтнасць рэалізацыі суб'екта лірыкі ў сучаснай літаратуры Беларусі прасочым на прыкладзе паэтычнай творчасці Вікі Трэнас (Ляйкоўскай) – прадстаўніцы маладога пакалення творцаў. Мяркуючы па тэкстах, лірычная гераіня гэтай аўтаркі ўпэўнена існуе ў тэксце і з'яўляецца ўнікальным стварэннем, носьбітам асноўных маральных каштоўнасцей самой паэткі (наколькі магчыма аб гэтым меркаваць з інтэрв'ю, нататак), хаця і не пазбаўлена пэўнай тыпізацыі (зразумела, як любы вобраз у мастацтве). Моцны асобасны пачатак у вершах В. Трэнас спалучаецца з экзістэнцыйнасцю, інтэлектуальнай рэфлексіяй. У той жа час гераіня аўтарскай паэзіі не пазбаўлена рыс абагульненага вобраза, што выйшаў з усёй творчасці паэткі. Зразумець лірычную гераіню як цэласную асобу (зноў жа, наколькі гэта магчыма і апраўдана ў кантэксце літаратуразнаўчага дыскурсу) можна тады, калі прасочваецца і ўсведамляецца ўзаемадзеянне біяграфічных фактаў і мастацкага вымыслу, творчай экспрэсіўнасці і непадробленай пачуццёвасці выказванняў ад імя гераіні яе вершаў.

Рэалізацыя вобраза лірычнай гераіні ў паэзіі Вікі Трэнас з'яўляецца адметнай аб'ектывацыяй яе рэальнага «Я». Вікторыя – з Бум-Бам-Літу і адпаведна сябе маніфестуе, але эпатажная «дзяўчынка са свістком» – толькі адна з персаніфікацый лірычнай гераіні. Ёй найбліжэй не столькі гіперактыўны авангардызм, колькі экзістэнцыйная рэфлексія найвыразнага мадэрнізму з акцэнтам на ўнутраным свеце асобы. Відавочная блізкасць гераіні-апавядальніцы і рэальнай паэткі дае падставы для вызначэння творчага стылю Вікі Трэнас праз панящце аўтапсіхалагічнай паэзіі. Як піша сама аўтарка ў адным з вершаў: «тут змешчаны аўтабіяграфічныя звесткі / гэта стыль суіцыдальны авангардызм» [20, с. 33].

Віка Трэнас у сваіх вершах не імкнецца да абсалютнай аб'ектыўнасці, распавядаючы чытачу пра іншага чалавека ці здарэнне, таму што такія вершы адзінкавыя – «Superstar», «Паданне», «КАЛЫХАНКА». Ролевая лірыка ў кнізе зборнік «Цуд канфіскаванага дзяцінства» не прасочваецца. Складаней з размежаваннем такіх наратыўных фігур, як «я» або «мы» ў тэксце і аўтапсіхалагічнага лірычнага героя (суб'ект-у-сабе). З аднаго боку, большасць вершаў рэпрэзентуе якраз першую асобу, з другога – адназначна адносіць «я» і «мы» да аўтапсіхалагічнага наратара або фізічнага аўтара і будаваць з такой пазіцыі тыпалогію лірычных суб'ектаў было б памылкай.

Варта гаварыць і пра наяўнасць постмадэрнісцкіх варыянтаў лірычнага «я», таму што ў «Цудзе канфіскаванага дзяцінства» прысутнічаюць моманты, дзе лірычная гераіня знікае ў радках: адчуць яё, «навобмацак» пазнаёміцца – нерэальна. Падсвядома складваецца разуменне, што герой ёсць, але ён схаваны ў розных пазіцыянаваннях і масках, міжволі распушчаны ў створаных аўтарам словах і з'яўляецца іх неад'емнай часткай.

У зборніку вельмі хутка адбываецца пераход ад аўтарскага «я» да значна менш індывідуалізаванага «мы» («паглядзі, мы цяпер як крыжы… / мы – грыпозныя дрэвы…» [20, с. 20]). Тым не менш праз апошні займеннік паэтка выразіла тое асабіста-набалелае, што не хочацца перажываць у адзіноце (напрыклад, аднарадковы верш «Мы жывем – і, значыцца, мы вар'яты» [20, с. 32], а таксама радкі «мы – дзеці, зробленыя са сталі / мы – проста сны» [20, с. 71], «мы – носьбіты нічыйнай мовы» [20, с. 73]).

Разнастайнасць суб'екта лірыкі дазваляе вылучыць некалькі ўмоўных груп. Першая і самая вялікая звязана з экзістэнцыяльным пачуццём адзіноты («Я бы ў пустэльні, бы ў пустэчы, бы ўва сне, / Валошка чэзлая сярод памерлых душаў» [20, с. 19]; «Ad majoj samoty słovy łajucca na papieru» [20, с. 49]; «Мяне зразумець складана – застанься са мною сам-насам» [20, с. 58] і г. д.). Увогуле,

да гэтай групы далучаюцца вершы, аб’яднаныя матывамі смутку, адчужэння, няшчасця, роспачы, болю. Так, даследчык А.Макмілін піша: «…лірычны герой Вікі Трэнас жыве ў стане эмацыйнай фрустрацыі: у „Назаўжды“ самотныя твары дрэваў, верагодна, становяцца сведкамі самазабойства каханага паэткі, а іншы верш, „HSYAOD“, завяршаецца словамі, якія чытаюцца як квінтэсэнцыя адзіноты…» [24]. На другое месца выйшла постмадэрнісцкая адсутнасць выражанага лірычнага «я» (вершы «ап’янелы ад суму паэт любаваўся сабой…», «ссівелыя вейкі твае прымрояцца ў сне…», «HSYAOD» і інш.). Трэцяя група – супрацьпастаўленне лірычнага героя «іншым» (вершы «Ня тое», «Уяўленне», «мацнею пад лязом сякеры…»).

У «Цудзе канфіскаванага дзяцінства» назіраем Асобу, што дасягнула пэўнага кансэнсусу як са сваім «я», так і са знешнім светам: унутраны канфлікт не даходзіць да катастрофы, а асэнсоўваецца гераіняй, паддаецца абгрунтаванню і аналізу.

Другі зборнік «Экзістэнцыйны пейзаж», хоць і працягвае гучанне першага, але ўсё ж трансфармуецца. У ім больш «самасці», даросласці, самаўпэўненасці і халоднай сур’ёзнасці. Самота і хваравітае адчуванне сябе і свету не зніклі, хіба што сталі яшчэ больш інтэлектуальна заглыбленымі і трывалымі («Я ў вашых палацах – Іуда» [25, с. 7], «камяком у горле захрасла жаданне быць» [25, с. 73]). Псіхалагічная сувязь паміж аўтаркай і лірычнай гераіняй значна ўзмацнілася, набыўшы сілы літаратурна-паэтычнай самасвядомасці («на праспекце шматлікіх верлібраў сцёбна / я іду, адчуваю сябе нязмушана» [25, с. 38], «у гняздзе маёй душы / растуць птушаняты вершаў» [25, с. 14]). Пераасэнсоўваецца само паняцце «верш», яно страчвае негатыўна-прароцкае значэнне, што назіраецца ў першым зборніку. У цэнтры ўвагі лірычнай гераіні другой кнігі знаходзяцца такія паняцці, як «мора», «адлегласць», «смак», «горад».

Семантыка мора (вады ўвогуле) можа сведчыць пра неаднастайнасць душэўнага стану лірычнага суб’екта, зменлівасць яго настрою і свавольніцтва. Праз дадзены вобраз суб’ект лірыкі знаходзіць сувязь з аб’ектам свайго кахання. Адлегласць упарта пераадольваецца праз словы і выказаны боль. Горад – месца, якое ўспрымаецца лірычнай гераіняй як канкрэтнае (часцей), так і абстрактнае, сведчыць пра пэўныя граніцы, адданасць зямному.

Зборнік насычаны назвамі месяцаў, што падкрэслівае пэўны час і адпаведны настрой. Менавіта зімовыя месяцы лірычная гераіня атаясамлівае з сабой, нярэдка ў супрацьпастаўленні з цёплымі перыядамі года. Вясна і лета не знаходзяць такога моцнага водгуку ў душы лірычнага «я» і часцей

становяцца проста выражэннем хвілінных уражанняў, ускладняючы візуальную карціну свету.

Такім чынам, заўважным выступае факт эвалюцыі лірычнай гераіні Вікі Трэнас, што можна патлумачыць пэўнымі зменамі светапоглядных арыенціраў самой паэткі. У працэсе асэнсавання сябе і акаляючай рэчаіснасці яна пазбаўляецца боязі, няўпэўненасці і нерашучасці дзеля таго, каб акрыяць і з поўнай сілай адгукнуцца на рэальнасць. Увогуле, заслуга аўтаркі ў тым, што яна змагла зрабіць лірычнага героя максімальна жывым і сапраўдным. І хоць экзістэнцыйныя праявы ў паэзіі не адкрыццё аўтара, хоць тэмы, якія закранаюцца ў кнізе, не новыя – Віка Трэнас змагла аформіць словы і апрацаваць праблематыку сваіх вершаў на годным узроўні, прапусціўшы іх праз сябе і надаўшы ім шчырае гучанне. Да таго ж шлях развіцця яшчэ не скончаны, кожны этап – важная прыступка да наступнага ўвасаблення.

## Літаратура

1. *Макмілін, А.* Парасткі ў халодным краі: маладыя беларускія паэты сёння (Вальжына Морт і Віка Трэнас) [Электронны рэсурс] / А. Макмілін. – Рэжым доступу: https://belbritain.wordpress.com/2008/03/05/mcmillin-mort_trenas. – Дата доступу: 13.03.2019.

2. *Трэнас, В.* Цуд канфіскаванага дзяцінства: вершы / В. Трэнас. – Мінск: Логвінаў, 2005. – 94 с.

3. *Трэнас, В.* Экзістэнцыйны пейзаж / В. Трэнас. – Мінск: Галіяфы, 2008. – 84 с.